Для Свидетелей Иеговы основой религиозной жизни остаётся собрание. Но поскольку созыв собраний и участие в них означает возобновление деятельности запрещённой религиозной организации, Свидетели Иеговы проводят собрания нелегально, под видом разного рода встреч (например, вечера танцев), и в случаях обнаружения таковых сотрудниками правоохранительных органов, заявляют о легальности этих встреч.

Финансирование деятельности запрещённой религиозной организации также является преступлением, а к такой деятельности могут быть отнесены регулярные пожертвования последователей деноминации. Если до ликвидации местных религиозных организаций финансовая деятельность осуществлялась за счёт закупок литературы для проведения миссионерской деятельности, пожертвований на собраниях и при отчётах, то в настоящее время значительная доля пожертвований осуществляется дистанционно – через банковские операции он-лайн или другие способы перевода денежных средств.

Таким образом, дистанционные технологии пришли на помощь Свидетелям Иеговы в России, но данное религиозное объединение не видит для себя перспективы превращения в «кибер-церковь», отстаивая право свободно собираться для удовлетворения своих религиозных потребностей.

## Литература

1. Постановление Пленума Верховного Суда Российской Федерации от 28 июня 2011 г. № 11 «О судебной практике по уголовным делам о преступлениях экстремистской направленности» (в редакции Постановлений Пленума Верховного Суда РФ от 03.11.2016 № 41, от 20.09.2018 № 32).

2. Какие приговоры выносят Свидетелям Иеговы? [Электронный ресурс.] URL: https://jw-russia.news/news/about/faq/7.html (Дата обращения: 7.03.2021).

УДК 392:273.2(476.5)

# СТАРАВЕРЫ ПАЎНОЧНА-ЎСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.: АСАБЛІВАСЦІ РАССЯЛЕННЯ

**Аўсейчык Уладзімір Яўгенавіч,**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Наваполацк, Беларусь)

*У артыкуле разгледжаны асаблівасці рассялення стараверскага насельніцтва паўночна-ўсходняй Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. На аснове аналізу статыстычных матэрыялаў вылучаны асноўныя месцы пражывання старавераў на тэрыторыі рэгіёна, прасочана дынаміка іх колькасці.*

Большая частка тэрыторыі паўночна-ўсходняй Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. адміністрацыйна адносілася да Віцебскай губерні. У гэты перыяд губерня з'яўлялася лідарам па колькасці старавераў сярод іншых беларускіх губерняў. Большасць старавераў Віцебскай губерні адносіліся да беспапоўскага толку. У рэгіёне пражывалі федасееўцы, філіпоўцы і паморцы. На тэрыторыі беларускіх паветаў жылі і стараверы-папоўцы веткаўскага сагласа [1].

Тэрытарыльна Віцебская губерня ўключала не толькі беларускія землі (у сучасных адміністрацыйных межах), але і сучасныя тэрыторыі Латвіі і Расіі. Як вынікае са статыстычных даных, асноўная частка старавераў Віцебскай губерні пражывала якраз не на беларускіх землях. Праілюструем гэту сітуацыю на аснове даных перапісу 1897 г., якія вылучаюцца найбольшай дакладнасцю. Так, на 1897 г. па Віцебскай губерні налічвалася 83 022 стараверы. Пераважная большасць іх (каля 73% ад агульнай колькасці) пражывала на тэрыторыі Рэжыцкага, Люцынскага і Дзвінскага паветаў (сучасная тэрыторыя Латвіі). Разам з тым, значная колькасць старавераў пражывала ў Веліжскім, Невельскім і Себежскім паветах, тэрыторыя якіх у сучасны перыяд адносіцца да Расійскай Федэрацыі. На гэтыя тры паветы прыходзілася каля 9,5% ад агульнай колькасці старавераў губерні. У той жа час, як сведчаць даныя перапісу 1897 г., на беларускія землі прыходзілася толькі каля 17,5% ад агульнай колькасці старавераў Віцебскай губерні [4, с. 74]. У Табліцы прадстаўлены даныя аб колькасці старавераў і аднаверцаў у беларускіх паветах Віцебскай губерні (г.зн. тэрыторыя якіх уваходзіць у сучасныя межы Беларусі).

**Размеркаванне старавераў па беларускіх паветах Віцебскай губерні (1861 – 1902 гг.)**

| Год | Колькасць старавераў у паветах Віцебскай губерні (чал.) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віцебскі | Гарадоцкі | Дрысенскі | Лепельскі | Полацкі | Усяго |
| **1861** | 1 412 | 225 | 268 | 367 | 2 141 | **4 413** |
| **1882** | 3 740 | 496 | 257 | 799 | 3 591 | **8 883** |
| **1897** | 6 622 | 734 | 373 | 844 | 5 953 | **14 526** |
| **1902** | 8 403 | 2 080 | 385 | 997 | 5 999 | **17 864** |

[складзена аўтарам на аснове: 2, с. 613; 3, с. 164-169; 4, с. 74; 5, с. 90-95].

Як бачна з прыведзеных у Табліцы 1 даных, лідарамі па колькасці старавераў у рэгіёне былі Віцебскі і Полацкі паветы. У іх пражывала звыш 80% ад усіх старавераў беларускай часткі Віцебскай губерні. Акрамя таго, у Віцебскім павеце налічвалася значная колькасць аднаверцаў. У той жа час, як вынікае з даных, прадстаўленых у Табліцы 1, у Дрысенскім павеце старавераў пражывала мала. У Гарадоцкім і Лепельскім паветах старавераў налічвалася значна менш, чым у Віцебскім і Полацкім. Асноўная маса старавераў Лепельскага павета пражывала ў паўднёва-усходняй яго частцы (Гарадчэвіцкая, Цяпінская і Бачэйкаўская воласці) [6, с. 24]. У сучасны перыяд гэта тэрыторыя памежжа Лепельскага, Чашніцкага і Бешанковіцкага раёнаў. На пачатку XX ст. стараверы пражывалі ў 94 населеных пунктах Віцебскага, у 164 – Полацкага, у 26 – Гарадоцкага, у 31 – Лепельскага паветаў [1, с. 122].

Асноўныя цэнтры старавerства беларускіх паветаў Віцебскай губерні размяшчаліся на тэрыторыі сучасных Віцебскага, Шумілінскага, Полацкага, Бешанковіцкага і Чашніцкага раёнаў. У “Памятнай кніжцы” Віцебскай губерні на 1914 г. пералічаны 4 стараверскія абшчыны ў г. Віцебску (2 беспапоўскія і 2 папоўскія аўстрыйскага сагласу). У Віцебскім павеце налічвалася 6 абшчын: у в. Грышаны і в. Падлазнікі Мішкаўскай воласці, маёнтку Сумы Бабінічскай воласці, в. Краснаполлі Жарэбічскай воласці, маёнтку Увалокі Старасельскай воласці, Полцеўская абшчына (маёнтак Шуміліна). У Лепельскім павеце было

2 абшчыны: Балтурынская абшчына у м.Бешанковічы і федасееўская абшчына ў в. Должыца Цяпінскай воласці. Адна абшчына старапаморскага сагласу існавала ў г. Полацку. Пяць абшчын налічвалася ў Полацкім павеце: у в. Шмана і Латкова Ловажскай воласці, в. Забор’е і в. Жалудова Міхалоўшчынскай воласці, в. Вялікія Жарцы Артэйкавіцкай воласці [7, с. LI-LVI].

Важным цэнтрам стараверства на беларускіх землях быў Барысаўскі павет Мінскай губерні. Асноўная маса старавераў Барысаўскага павета пражывала ў паўночнай яго частцы. У сучасны перыяд гэта тэрыторыя памежжа Барысаўскага, Крупскага і Чашніцкага раёнаў. Сярод цэнтраў стараверства ў гэтым рэгіёне з сярэдзіны ХІХ ст. вылучаліся засценак Бабарыкі і засценак Будзішча. У гэтых населеных пунктах існавалі і стараверскія малельні. У 1858 г. у павеце пражывала 1 493 стараверы, у 1871 – 1 242, у 1897 г. – 4 023, у 1913 г. – 4 872 [9, с. 22-29; 10, с. 232; 8, с. 78; 11, с. 72].

Істотная колькасць стараверскага насельніцтва налічвалася і ў паўночных паветах Магілёўскай губерні – Сенненскім і Аршанскім. Колькасць старавераў у Аршанскім павеце да пачатку ХХ ст. заставалася нязначнай. Так, у 1859 г. тут пражывала толькі 17 старавераў. У 1888 г. іх колькасць склала ўжо 163 чалавекі, а да 1914 г. вырасла да 620. У паўночнай частцы Магілёўскай губерні асноўная маса стараверскага насельніцтва адносілася да Сенненскага павета. У 1859 г. тут пражывалі 1 064 стараверы, у 1888 г. – 3 111, у 1897 г. – 4 605, у 1914 г. – 6 019 [12, с.14-22; 13, с.72; 14, с. 94; 15, с. 46]. Большая частка старавераў Сенненскага павета пражывала ў паўночнай яго частцы ў Астровенскай, Машканскай і Латыгаўскай валасцях (сучасная тэрыторыя Бешанковіцкага і Сенненскага раёнаў). Частка старавераў пражывала ў заходняй частцы павета (Лукомльскай, Лісічынскай і Бобрскай валасцях) на мяжы з Барысаўскім і Лепельскім паветамі [16, с. 104].

Трэба адзначыць, што ў паветах Магілёўскай губерні, якія знаходзіліся на поўдні ад Сенненскага і Аршанскага, старавераў пражывала мала. Амаль не налічвалася іх у Горацкім, Клімавіцкім, Мсціслаўскім паветах. Невялікая колькасць пражывала ў Быхаўскім і Чавусскім паветах. Толькі ў Магілёўскім павеце пражывала значная колькасць старавераў. Такім чынам, Сенненскім і Аршанскім паветамі замыкаўся паўночна-ўсходні арэал рассялення старавераў на Беларусі.

Такім чынам, у другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. у паўночна-ўсходняй частцы Беларусі пражывала значная колькасць стараверскага насельніцтва. Рэгіён з’яўляўся адным з важнейшых месцаў кампактнага пражывання старавераў на беларускіх землях. У межах рэгіёна стараверы пражывалі ў Полацкім, Віцебскім, Гарадоцкім, Сенненскім і Аршанскім паветах, а таксама ва ўсходняй частцы Лепельскага і паўночных землях Барысаўскага паветаў.

## Літаратура


1. Гарбацкі, А. А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стст. / А. А. Гарбацкі. – Брэст: БрДУ, 1999. – 202 с.
2. Памятная книжка Витебской губернии на 1863 год. – Витебск: Тип. губ. правл., [б. г.]. – [1], 7, 642, 57 с.
3. Памятная книжка Витебской губернии на 1884 год. – Витебск: Тип. губ. правл., 1884. – V, 329 с.
4. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел; Под ред. Н.А. Тройницкого. – СПб.: Тип. Т-ва «Народная польза». – [Вып.] 5: Витебская губерния. – Тетрадь 3. – 1903. – [4], XIV, 283 с.

5. Памятная книжка Витебской губернии на 1904 год. – Витебск: Губ. типо-лит., 1903. – VIII, 32, 256, 119, 19 с.
6. Горбачевский, И.Д. Лепельский уезд Витебской губернии / И.Д. Горбачевский. – Витебск: Губ. тип., 1895. – 38 с.
7. Памятная книжка Витебской губернии на 1914 год. – Витебск: Губ. тип., 1914. – [2], VI, 280, LXX, 42 с.
8. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел; Под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Тип. С.-Петербургской тюрьмы. – [Вып.] 22: Минская губерния. – 1904. – [4], XVI, 243 с.
9. Памятная книжка Минской губернии на 1860 год. – Минск: Тип. губ. правл., 1859. – 155, 112 с.
10. Памятная книжка Минской губернии на 1873 год. – Минск: Губ. тип., 1872. – 293 с.
11. Памятная книжка Минской губернии на 1915 год. – Минск: Губ. тип., 1914. – 232, 185, III с.
12. Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. – Могилев: Тип. губ. правл., 1861. – 18, 34, 106, 115, 144, 52, 8 с.
13. Памятная книжка Могилевской губернии на 1890 год. – Могилев: Тип. губ. правл., 1890. – 464 с.
14. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел; Под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Тип. Спб. акц. общ. «Слово». – [Вып.] 23: Могилевская губерния. – 1903. – [4], XVI, 276 с.
15. Памятная книжка Могилевской губернии на 1916 год. – Могилев: Губ. тип., 1916. – XVI, 256, X, 69, 72 с.
16. Аникиевич, К.Т. Сенненский уезд Могилевской губернии / К.Т. Аникиевич. – Могилев: Могил. губ. стат. ком., 1907. – 148 с.

УДК 271-055.2

## РЫМСКА-КАТАЛІЦКІЯ ЖАНОЧЫЯ МАНАСКІЯ СУПОЛЬНАСЦІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

**Аўсейчык Юлія Аляксандраўна,**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Наваполацк, Беларусь)

*У артыкуле разгледжана гістарыяграфія гісторыі рымска-каталіцкіх жаночых манаскіх супольнасцей. Прааналізавана як айчынныя, так і замежныя (польскія) даследаванні.*

Асаблівасцю рымска-каталіцкай царквы з’яўляецца вялікая колькасць разнастайных мужскіх і жаночых ордэнаў, кангрэгацый і супольнасцей. Перыяд 1920–30-х гг., калі значная тэрыторыя Беларусі з’яўлялася часткай Польшчы, быў даволі спрыяльны для стварэння і рэлакацыі жаночых манаскіх рымска-каталіцкіх супольнасцей.

Нягледзячы на значную ролю жаночых манаскіх супольнасцей у місіянерскай і адукацыйнай дзейнасці на беларускіх землях, у навуковых працах, што выйшлі ў Беларусі, амаль не сустракаецца ніякіх звестак пра іх. Адзіным энцыклапедычным даведнікам па дадзенай праблематыцы з’яўляецца “Рэлігія і царква на Беларусі” [4], які ўтрымлівае невялікія звесткі пра жаночыя каталіцкія манаскія супольнасі. Што датычыцца прац манаграфічнага характару, то яны носяць абагульняючы характар і матэрыялаў па дадзенай тэме амаль не ўтрымліваюць. Варта адзначыць, што найбольш увагі праблемам дзейнасці жаночым манаскім супольнасцям ўдзяляе Э.С. Ярмусік [5].

На тэрыторыі Беларусі былі заснаваны дзве супольнасці: сясцёр эўхарыстак і сясцёр місіянерак. Менавіта таму гэтыя дзве супольнасці з’яўляюцца найбольш цікавымі для нашага вывучэння.